НАВІНКІ

17 - 24 лютага 2000 №3(25) Кошт свабодны

КАХАНЬНЕ?

НА ГЭТА ПРОСТА НЯМА ЧАСУ!

Анты-Валянцінка

(Аб шкоднасьці перайманых чужынскіх сьвятаў у кантэксьце захаваньня стабільнасьці ў грамадзтве)

Можна з пэўнасьцю канстатаваць, што Захад выйграе культурную вайну за мозгі маладых. Беларуская моладзь, атручаная заходняй прапагандай, сьвяткуе нейкія сьвяты, якія нашы продкі і ў часы сярэднявечнага цемрашальства ня ведалі. Яскравы прыклад – д'ябальскі Хэлоўін або бязроднае сьвята Сьв.Валянціна, які стаў кумірам студэнцкіх інтэрнатаў.

Дзякуй Богу – у сьвеце шырыцца рух праціўнікаў сьвяткаваньня гэтага ідыёцкага фэсту. Малінай праціўнікаў сьвята ўсіх закаханых стаў сайт, які вы можаце лёгка знайсьці ў Інтэрнэце. Сайт уяўляе сабой набор заборыстых тэкстаў і лінкаў, лейтматыў тэарытычных прагонаў якіх – адмоўны бок каханьня.

«Каханьне – гэта найбольш небясьпечная зьява для грамадзтва, што патрабуе вашых грошай, часу, творчасьці і розуму,» – піша нехта. – «Урубіце радыё. Што вы чуеце – ідыёцкія шлягеры пра каханьне, паглядзіце яшчык – што вы бачыце? Саплівыя сцэны з бразыльскіх сэрыялаў. Ідзе настойлівая ўстаўлялава адпаведнага вобразу жыцьця. Калі б не каханьне, КПД чалавецтва мог быць куды прадукцыйней. Каханкі ў плянэ творчасьці – адстойныя асобы. Яны западаюць у нейкія стандартныя клішэ паводзінаў. Вялікія людзі рабілі вялікія адкрыцьці дзякуючы таму, што іхныя мазгі не былі засьмечаныя пошлымі плоцкімі думкамі». Цяжка не пагадзіцца з такімі аргумэнтамі. Хіба калі б Лукашэнка быў закаханы, ці прыйшла б яму ў галаву эўрыка – забадзяжыць Расейска-Беларускі Саюз. Зразумела, не. У яго б іншае было б на ўме. Каханьне робіць вас дурным. Гэта ня трызьненьне сівой каровы, а навуковы факт.

Яшчэ больш бяруць за жывое прагоны нейкага Роўна, які даводзіць, што каханьне адказнае за глябальныя праблемы чалавецтва, напрыклад – дэмаграфічны крызыс (каханьне вядзе да сэксу і г.д). Магчыма, сусьветны ўрад павінен прыняць гэта пад увагу гэты аспэкт каханьня і прыпыніць прапаганду слашчавых рамантычных сюжэтаў па ТБ і ў кіно.

Эканамічным аспэктам пытаньня каханьня займаецца на сайце яшчэ адна сьветлая галава. Каханьне робіць вас банкрутам. Існуюць такія жыцьцёва неабходныя рэчы як ежа, дах над галавой і адзеньне...

На стар.4

Тэлегледачы абіраюць канал БТ

Стар.2

Хто каго мачыў 17 кастрычніка? *(Новыя падрабязнасьці)*

Стар. 3



і сьв. ВАЛЯНЦІН

Комікс на стар. 8

ARCHE

ПАПЕРА

НЕ для ГЭТАГА!

Газэта «Навінкі» выходзіць зь лютага 1998 г. Зарэгістраваная ў Дзяржаўным камітэце па друку Рэспублікі Беларусь 23.02.1999 г. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі №1272. Заснавальнікі: П.Канавальчык, А.Новікаў, А.Мазур. Галоўны рэдактар Паўлюк Канавальчык. Падпісны індэкс **63439**. Адрас для карэспандэнцыі: п/с 33, 220134 Менск, БЕЛАРУСЬ; E-mail: navinki@user.unibel.by; Адрас рэдакцыі: г.Менск, пр.газ.«Известия», 9-143.

Нумар падпісаны да друку 14.01.2000 г., а 23.01. Тыраж 5200 экз. Надрукавана з гатовых дыяпазытываў заказчыка на паліграфічнай фабрыцы «Чырвоная Зорка» ВПП імя Я.Коласа, г. Менск, 1-ы Загарадны зав., 3. Заказ №1615

Сямейны Боінг

Якім чынам нелегальна перасекчы дзясятак межаў і не натрапіць на пагранічны патруль

Колькі ні тужацца эўрапейскія буржуіны паставіць затычку на шляху нелегальных мігрантаў з Трэцяга сьвету, апошнія як клалі, гэтак і кладуць экскрымэнтамі на антыэміграцыйныя захады Захаду.

Вось вам для прыкладу – эпапэя з хайджэкам афганскага аэрапляну, які нібыта быў захоплены тэрарыстамі. Сталёвая птушка прапархала па ўсёй Эўразіі ад Казахстану да Брытанскіх мароў. На кожнай запраўцы «тэрарысты» выпускалі з самалёту некалькі закладнікаў, якія адразу бадзёра ішлі патрабаваць палітычны прытулак. Спачатку, у Казахстане і Маскве, вызвалялі самых бамжаватых і брудных. Да «Хітроў» даляцелі самыя тлустыя закладнікі ў пярсьцёнках з залатымі зубнымі пратэзамі. Пакуль заходнія палітыкі спрабавалі выконваць а-прыёры фантасмагарычныя патрабаваньні тэрырыстаў (кшталту, падстрыгчы Бэн Ладэна пад Олбрайт і зрабіць эўрарамонт у былым палацы Аміна), афганскія браты Гафс здаліся на міласьць ангельскай каралеве, і ўсе як адзін падалі заявы на палітычны прытулак у Злучаным Каралеўстве.

Вось тут і раскрылася ўсходняя тонкасьць. Аказалася, што ўсе пасажыры рэйсу – сваякі з аднаго племя, якія даўно ўжо марылі падсесьці на хвост бюджэтам багатых эўрапейскіх нацыяў. Скупіўшы ўсе квіткі на адзін з лакальных авіярэйсаў, «палітычныя дысыдэнты» выцягнулі запалкі, хто будзе крывавым тэрарыстам, а хто ахвярай-закладнікам. Потым з імем Алаха яны пагрузіліся ў самалёт і імітавалі хайджэк.

Так ці інакш, але выкрытых гора-закладнікаў вярнулі Талібану, дзе іх чакае шарыяцкі суд за ўгон ісламскага лятальнага сродку й сьмяротнае пакараньне праз чацьвертаваньне. Пашанцавала толькі «тэрарыстам», якія будуць матаць пажыцьцёвы тэрмін у цывілізаванай брытанскай «зоне» ●

Усама бэн Ладэн

Многія пуштунскія дэхкане купляюцца на рэклямныя постэры навaяўленых Хаджэй Насрадзінаў

Венская «гарачая зіма»

Прыход аўстрыйскіх нацыкаў да ўлады падсадзіў нэолібэральны Захад на ізьмену



Імя навaяўленага фюрэра аўстрыйскай нацыі Ёрга Хайдэра не сыходзіць з вуснаў чыноўнікаў Эўрасаюзу. Якім чынам гэты выскачка з глухой правінцыі Карынтыя здолеў перамагчы на выбарах у мясцовы Вярхоўны Савет, чаму электарат пайшоў за рэваншыстамі з Партыі Свабоды?

А між тым Захад упарта не заўважае таго аспэкту, што Аўстрыя найбольш пацярпела ад развалу Трэцяга Рэйху і разрыву гаспадарчых сувязяў з традыцыйнымі пастаўшчыкамі чалавечых валасоў і ўгнаеньняў, гэтак неабходнымі аўстрыйскай прамысловасьці. Паўвякі панаваньня сацыялістаў розных масьцяў не прынесьлі Аўстрыі доўгачаканай плянавай эканомікі, жалезнай заслоны й піянэрскіх лягераў. Краіна пагрузілася ў рыначны хаос і эпоху сацыяльна арыентаванага капіталізму. «Пры аншлюсе мы ўгнаялі глебу натуральнымі ўгнаеньнямі на яўрэйскай сыравіне. А цяпер – адныя хімікаты й генная інжынэрыя!» – узрушана кажа звычайны аўстрыйскі баўэр. Народ стаміўся ад левых абяцанак.

«Наш аўстрыйскі народ прызвычаіўся жыць у Вялікай дзяржаве!» – дэмагагічна заяўляе Хайдэр. І ня хлусіць. Адно з галоўных праграмных патрабаваньняў Партыі Свабоды – аншлюс зь Нямеччынай і аднаўленьне Тысячагадовага германскага рэйху. «Нашы народы спакон веку жылі разам. У нас нават ёсьць сваякі ў Мюнхенскай вобласьці. Менавіта таму я галасаваў за партыю Хайдэра». Большасьць аўстрыякаў падтрымліваe свайго «фатэра», спадзеючыся, што той уваліць па першае чысло карупцыянэрам-сацыялістам, прафсаюзным босам, а за адно разьбярэцца з гэтымі русавалосымі недачалавекамі, што гандлююць рамашкамі і васількамі на Венскім рынку.

Нават са зьнешняга выгляду Хайдэр усё болей пачынае нагадваць свайго зямелю Дольфі

Але Захад не падзяляе настрояў аўстрыйскага народу. Ужо адкліканыя паслы ЗША і Ізраілю, афіцыйна заявіўшы, што быццам бы іхныя рэзыдэнцыі ў Дрэздэндорфе забраныя пад райкам Партыі Свабоды. Чым скончыцца дыпляматычны канфлікт Эўрасаюзу й афіцыйнай Вены, сказаць цяжка. Вядома, што Кангрэс ЗША ўхваліў праграму падтрымкі маргінальнай сацыялістычнай апазыцыі ў Аўстрыі, якая ўжо правяла шэраг супрацьпраўных акцыяў у Вене, што скончыліся бойкай зь сіламі аўстрыйскага гестапа ●

Эрнэст Тэльман

СтО-мэтрОўка

Путаны ад Купалы

У эпіцэнтар крытыкі непрыяцеляў расейска-беларускага саюзу ў апошнія дні трапілі прастытуткі. Гарластая *Наша Ніва* закацілa гістэрыку, што 7% маскоўскага рынку путанаў кантралююць беларускія



начныя матылькі, якія зьяўляюцца маторчыкам пабудовы агульнага славянскага дому. На самой справе акупацыя маскоўскага рынку з боку нашых распусьніц мае выключна пазытыўны характар.

Цяпер, калі палітычных сродкаў захаваньня беларускай незалежнасьці застаецца ўсё менш і менш, самы час прыгадаць пра ролю дзяўчын лёгкіх паводзінаў у нацыянальна-вызвольнай барацьбе.

На думку прыходзіць біблейская гісторыя пра юдзейскую Юдзіф, што працавала наложніцай у пэрсідзкага набаба і ахвяруючы сваім целам, выратавала нацыю ад іншаземнага прыгнёту.

Гэтак сама калі-небудзь лагойская пышка, трапіўшы ў саўну новага Скуратава, масіруючы ягоны тлусты чэлес, магла за нефіг выклянчыць для радзімы новую канстытуцыю, і нават (чаму і не) незалежнасьць!

А нацыяналісты паднялі шуміху наконт сэксуальнай эксплюатацыі суайчыньніц.

А каму як ня ім ведаць крылатую фразу клясыка: «Хто кантралюе вуліцы, той кантралюе краіну».

МІні-навІнкі

Другому каналу быць!

Апошнім часам у беларускім грамадзтве не сьціхаюць дыскусіі наконт адкрыцьця другога беларускага тэлеканалу БТ-2. Усё б добра, але адкрыцьцё каналу зьвязана з такім аспэктам, што тэлеперадатчыкі разьлічаныя на падтрыманьне толькі пяці тэлеканалаў. Тут і зарыты яблык раздору. Якім каналам ахвяраваць дзеля БТ-2? Раздаваліся нават меркаваньні, што такога каналу ўвогуле ня трэба.

Мы вырашылі правесьці ўласнае незалежнае сацыялягічнае апытаньне. Рэпрэзэнтатыўная выбарка 1000 чалавек (прадстаўленыя ўсе рэгіёны Беларусі). Рэспандэнтам было прапанавана адказаць на наступнае пытаньне:



«Ці патрэбны нам другі беларускі тэлеканал?». Нас узрушыў адзінагалосны адказ «так!» усіх рэспандэнтаў. «Болей каналаў, добрых і розных!»

Наступнае ж пытаньне «Якім каналам Вы гатовыя ахвяраваць, каб глядзець БТ-2?» дала наступныя вынікі (гл. дыяграму). Пераважная большасьць рэспандэнтаў у адказе на гэтае пытаньне выбрала БТ-1.

Рабіце высновы, спадарства з Макаёнка-9.

Справа Бабіцкага жыве

Праблему з расейскімі палоннымі можна лічыць цалкам вырашанай. Менавіта да такой думкі можна прыйсьці пасьля ўдалай афэры з Андрэем Бабіцкім. Уяўляеце, за аднаго журналюгу даюць двух, а калі патаргавацца, то і ўсіх трох расейцаў.

Ужо сталі вядомыя афіцыйныя курсы абмену жывым таварам, прадастаўленыя нам міністэрствам па справах закладнікаў РФ.

Расцэнкі наступныя:

1 журналіст Радыё Свабода (расейская служба) – 2-3 салдата

1 журналіст Радыё Свабода (беларуская служба) – 1 салдат

1журналіст Радыё «Рокс», Альфа-радыё, радыё Бі-Эй – 0,5 салдата

1 журналіст Радыё «Стыль» – 0,01 салдата (вушы, пальцы і інш. дробныя часткі цела).

Як бачым, найбольш высокія курсы журналістаў на Свабодзе. Карысьць ад іх відавочная: каб дапамагчы расейскім саюзьнікам, варта было б сабраць усю гэту кіпу пранатаўскіх барзапісцаў ды вызваліць з чачэнскага палону дзясятак-другі браткоў славянаў.

УвАзе пЫльных эрудЫтаў

Знайдзі 10 адрозьненьняў

Вашай увазе прадстаўляюцца два фотаздымкі. Здагадайцеся, на якім зь іх Грозны да вайны, а на якім сучасны выгляд Чачэнскай сталіцы. Той, хто першы дашле ў рэдакцыю правільны адказ, атрымае партрэт Пуціна з подпісамі супрацоўнікаў рэдакцыі.





Для аматараў расейскіх каналаў: адказы на пытаньні конкурсу можна знайсьці на старонцы 7.

Адзін дзень паходжаньня бравага прыпісьніка-школьніка ва салдаты

Рэкрутчына

Яшчэ з раньняга дзяцінства ідзе падрыхтоўка «гарматнага мяса» для ліквідацыяў гуманітарных катастрофаў

Першым крокам на шляху выкананьня доўгу перад Айчынай зьяўлецца паход у мясцовы ваенкамат у 16 гадоў. Праз гэта праходзяць усе будучыя артылерысты, танкісты, штабныя пісары і штрафнікі. Тут пасьля мэдагляду вырашаюць: ці праз два гады хлопцу трэба ісьці маршыраваць на пляц і есьці комбіжыр, ці можна пантаваща перад падругамі белым білетам. І вось на мінулым тыдні я сам пабываў у ваенкамаце. Нас, маладых прапісьнікоў, пастроілі ўздоўж сьцяны. Зьявіўся палкоўнік, які праз слова-мат давёў нам, як добра зараз у армі і як аб нас будуць клапаціцца. Але пры гэтым ня вытрымаў і пабяцаў, што адкасіць ад войска ніхто з нас, сапылёў, ня зможа. Далей у адным з баракаў нас рассадзілі па лаўках. Было так сумна, што заставалася толькі тупа разглядаць прыбіты да сьцяны стэнд «Воіны-інтэрнацыяналісты». У слове «інтэрнацыяналісты» мы ад скукі адразу зьбілі літары «інтэр». Нас застукалі, што называецца, на месцы злачынства, і павялі на прафілякгычную бяседу ў кабінэт вайсковага псыхоляга. Тут пад гнуснае бубненьне дыктара беларускага радыё нам пачалі трэпаніраваць мазгі і паабяцалі, што калі нам стукне 18, нас абавязкова прымусяць служыць дабравольцамі на Каўказе. У такім псыхалягічным стане мы накіраваліся на мэдычны агляд. Ён пачаўся з таго, што мэдсястра паставіла ўсім у мэдкарткі штамп «годен». Як аказалася, яна як у ваду глядзела. У акуліста нават калі ты казаў, што бачыш толькі літары першых двух радкоў, цябе называлі снайперам ці начным разьведчыкам. Далей па калідоры знаходзіўся кабінэт нэўрапатолага.

Пасьля візыту да яго, кульгаючы ад цяжкіх удараў малатком па калену, мы трапілі ў лапы лора. Апошні хутка падсеў на каня, бо ніводны не паўтарыў дакладна лічбу, што ён шаптаў сабе пад нос у кутку. «Глухары» – паставіў дыягназ доктар, нажаль у мэдычных картках гэта ніяк адзначана не было. Пакалупаўшыся ў носе і вушах, ён вынес ўсёй групе вырак: «Трэба лячыцца, і яшчэ раз лячыцца. Але я думаю да арміі і так усё пройдзе».

У стаматолага нам аптымістычна гарантавалі, што ў нашым узросьце зубамі можна дрот перагрызаць. Апошняй нас аглядала мужа-падобная, сівавалосая, зацягнутая ў ваенны мундзір, што на яе ледзь налазіў, урач-тэрапэўт. Яе мускулістыя рукі схапілі мой названочнік, у косых шарнірах нешта хруснула. Яна яшчэ трохі павярцела мяне ў сваіх кляшнях і адпусьціла на падлогу, буркнуўшы: «Хілаваты».

Напрыканцы нас разьмеркавалі па відах войскаў. Большасьць трапіла ў маракі-падводнікі. Шчасьліўчыкам гарантавалі сувязь. Увогуле, трэба сказаць вялікі дзякуй пэрсаналу ваенкамату за іхную катаржную працу. Каб не яны, нас чакаў бы чарговы прыкляты дзень у роднай школе зь яе нуднымі настаўнікамі і даўгушчымі ўрокамі. А так школу прасачкавалі і даведаліся шмат цікавага. Не зайздрошчу таму, каму зараз гадоў 14-15. Калі будзем дзедамі – адарвемся на гэтых салагах. ●

Алесь Швайкоўскі

МАрш

О, tempora! О, mores!

Траекторыя думак палітыкаў як дзьве кроплі вады падобная да сьветапогляду мэркантыльных галівудзкіх прадзюсэраў. Калі нейкі фільм прарываецца ў чарты, адразу ў кінапавільёнах муцяць працяг карціны. Напрыклад, Паліцэйская Акадэмія -2, Паліцэйская Акадэмія-3,4 і гд. да бясконцасьці. Прыкладна тое ж назіраем і ў палітычным бізнэсе. Не пасьпела публіка ачухацца ад Маршу Свабоды, як апазыцыянэры зарадзілі на сакавік Марш Свабоды-2, а на красавік Марш Свабоды-3. Аднак тут палітычныя квазімоды зрабілі памылку. Каб заманіць на акцыю спажыўца (чытай, тынэйджэра) самой раскручанай назвы мала. Маркетынгавая практыка даводзіць, што трэба яшчэ нейкая ізюмінка. Напрыклад, Тэрмінатар-2 і падзагаловак «Судны дзень» і сэтэра. Думаецца, што апазыцыі трэба таксама мадэрнізаваць назву свайго новага праекту: Марш Свабоды-2. «Вяртаньне жывых трупакоў» або тыпу таго. Яшчэ лепш эксплюатаваць раскручваныя назвы вядомых сэрыялаў кшталту Зоркавых войнаў: Марш Свабоды-1. «Уяўная пагроза», Марш Свабоды-2. «Імпэрыя наносіць адказны ўдар», Марш Свабоды-3 «Вяртаньне Пазьняка» і гд. Паверце, ніводзін камплексануты школьнік не ўстаіць перад такім прамоўшнам, і пабяжыць на акцыю як міленькі.

Хто ж каго мачыў?

«Гэта мы, пераапранутыя міліцыянты, кідаліся камянямі на мітынгу 17 кастрычніка! Гэта мы кіравалі бунтам і накіроўвалі натоўп! Апазыцыя ня мае ніякага дачыненьня да масавых беспарадкаў!» Такая нахабная заява беларускага мянта скаланула ўсю краіну. Растыражаваны праз НТВ і газэты паклён на ўвесь дэмакратычны рух прывёў беларускую апазыцыю ў шаленства. Хваля абурэньня пракацілася па ўсёй краіне.

Публікацыя хлусьлівай заявы выклікала масавыя пратэсты з боку шараговых экстрэмістаў. «Ён хоча сказаць, што мы ўжо й каменю шпурнуць ня можам?! Як ён пасьмеў, гэты мянцяра пазорны, замахнуцца на самае сьвятое!» – залямантавалі пакрыўджаныя бывалыя адмарозкі. – «Гэта ж мы – самыя крутыя, гэта мы

мачыліся з АМАПам, нас ведае ўся краіна! І цяпер нейкі там мусар хоча перахапіць сабе ўсю славу?!».

Аднак гэта была толькі завязка. Працяг інфармацыйнай вайны не прымусіў сябе доўга чакаць. Днямі адзін зь сябраў «Белага Легіёну», прапаршчык АМАП у адстаўцы, які не пажадаў назваць сябе, зрабіў новую сэнсацыйную заяву, якая перакрэсьлівае ўсе ўяўленьні аб тактыцы апазыцыі.

«Сярод спэцназаўцаў былі пераапранутыя агенты апазыцыі. Гэта мы, пераапранутыя экстрэмісты, разганялі натоўп мінакоў і зявак, мы кіравалі пабоішчам. Гэта мы нясем усю адказнасьць за круцейшую махалаўку году! Мянты тут і побач не стаялі!» –сьцьвярджае ананімны адмарозак.

Да высьвятленьня пытаньня, хто ж каго мачыў увосень 99-га сапраўды яшчэ далёка. Аднак на пярэдадні Маршу Свабоды-2, які апазыцыя плянуе правесьці 15 сакавіка, простым грамадзянам можна толькі параіць абыходзіць стараной дэмакратычныя мітынгі і дэманстрацыі, бо як ні апранайся, хоць у адмарозка, хоць у мянта, хоць у чорта рагата – усё адно атрымаеш пілюляй.

Спачатку ад адных, потым ад другіх.

Разбушаваная Амэрыка

Вайна кампраматаў абвешчаная

За акіянам пачаліся праймэрыс – папярэднія выбары амэрыканскага прэзыдэнта. Адзін з галоўных кандыдатаў на тое, каб падмяніць у Белым Доме Клінтана, прадстаўнік рэспубліканскай партыі Джордж Буш-малодшы – сын былога Прэзыдэнта Буша і сёньняшні губэрнатар Тэхасу – траіў у непрыемную гісторыю.

Не пасьпеў наш каўбой выставіць сваю кандыдатуру, як знайшліся мясцовыя Дарэнкі – аматары пакапацца ў брудной бялізьне тэхаскага рэйнджэра. Хутка на сьвет зьявілася абойма кампрамату. Напрыклад выявілася, што ў свой час Буш-2 праз крутога бацьку адмазаўся ад Вітнама. Пакуль ягоныя аднагодкі ў патрыятычным аргазме паліваліся напалмам вісконгаўцаў, Джордж у штабе перакладаў паперкі.

Аднак сапраўдны шухер узьняўся, калі ў інтэрнэце зьявілася фотка Буша, які падсаджваецца на хі-хі пры дапамозе дарожкі какаіну. Страсьці разбушаваліся нежартоўныя: прапануюць прыцягнуць сынка экс-прэзыдэнта да адказнасьці паводле крымінальнага артыкулу, які ж сам Буш-2 дарэчы і ініцыяваў. Адпаведна яму, любы ўтык,нават калі ў цябе быў грам беспантоўкі, цягне на 27-30 гадоў. Натуральна, Буш заявіў, што здымак у сусьветным павуціньні – фуфэл, аднак паспрабуй дакажы.

У гэты цяжкі для кандыдата ад рэспубліканскай партыі час адзінаю маральную падтрымку ён атрымлівае ад.. наркотаў, якія занепакоеныя лёсам свайго корыша і дасылаюць яму лісты салідарнасьці.

«Я атрымаў 33 гады за тое, што талкануў 7 грамаў коксу, і таму ведаю ўсю гэтую пракурорскую кухню як дарогі на сваіх руках,» – піша з турмы Грын Бэй (ЗША) мэксыканскі эмігрант Р.Поца. – «Раю Вам сказаць сьледчаму, што знайшлі той какаін на вуліцы. Вам абавязкова скасьцяць пару гадкоў. Седзячы на нарах, я падтрымліваю Вашу барацьбу супраць клінтанаўскіх кайфаломаў. Браты і сёстры па-ўсім сьвеце, аднайцеся вакол кансэрватара Буша!» Вось яшчэ адзін ліст, на гэты раз з Магілеву: «Чувак, я разумею тваю ізьмену. Аднак ты сам вінаваты: фатаграфавацца падчас паходу – гэта ж як трэба было нанюхтарыцца. Асабіста мы сядзім тут на малачцэ і раім табе таксама. Гэта мазовы падагрэў, бо зьнешне канапляны адвар нагадвае звычайны кефір або малочны кактэйль. Ты як кандыдат зможаш наведваць любыя перадвыбарчыя мітынгі, дыпля-матычныя раўнды і іншыя Вашыя прытоны, не баючыся за сваю рэпутацыю салідната кансэрватыўнага бабра, фанатыка-баптыста і сябра хатніх гаспадынь. Акрамя таго, гэты зносіць башку пачышчэй за ўсе крэкі і гэры. Прыяжджай да нас улетку, Джордж, разам надзярбанім травы і зварым малачка».

Буш-малодшы зусім ня дурань раскатаць пару дарожак коксу ці засандаліць касяк чуйскай

Нарэшце, ліст ад самых маленькіх, што прыйшоў з далёкай Сібіры: «Трымайся, браза Буш! Пішуць табе таксікаманы сярэдняй школы №6 з г. Ніжнявартаўска. Мы толькі што платняком факнулі клей супэрцэмэнт, амаль ад'ехалі, аднак перад тым як мульцікі глядзець, сьпяшаемся дапісаць гэтыя радкі. Мы ганарымммсся таабоююю Джжж...».

Хіба можна заставанца абыякавымі, чытаючы такія разгоны. Калі Вы самі не таўстаскуры бегемот, не палянуйцеся чыркануць пару словаў для ахвяры дэмакратаў-фундамэнталістаў. E-mail contact: bush@ prihod.ru.

Старыку, ей-богу, будзе прыемна ●

Хведар Мэдэлынскі



«Дзірку вам ад бубліка, а не сынішку!» – катэгарычна заяўляе стары Буш

У НАШАЙ ПАЛАЦЕ
ВОЛЬНЫЯ МЕСЦЫ!
РАСЦЭНКІ РЭКЛАМНАЙ ПЛОШЧЫ:
НА 1 ПАЛАСЕ – 700 РУБ./СМ²
НА АСТАТНІХ ПАЛОСАХ – 500 РУБ./СМ²
ЗЬВЯЗВАЦЦА ПРАЗ ПЭЙДЖЭР: 2070000 ДЛЯ АБАНЭНТА 6159

Любіць па-беларуску

I LOVE you

Хрысьціянская канфэрэнцыя

БЕЛАРУСКАЯ ФОРМА—ХРЫСЬЦІЯНСКІ ЗЬМЕСТ

ПРА ЛЮБОЎ

- Бог цябе любіць!
- Любоў Божая і любоў чалавечая.
- Каханьне ў любві.
- Дачыненьні паміж мужчынам і жанчынай паводле Біблі.
- Любі!

УВАХОД ВОЛЬНЫ

4 лютага, 17⁰⁰, Варвашэні

Рэлігійны дыскамфорт у галаве Пашы Севярынца перайшоў ужо той рубеж, за якім адчыняюцца паранармальныя магчымасьці асобы. Наколькі моцным Божае слова зьяўляецца ў палітычнай барацьбе, ілюструе аўдыё-запіс перамоваў паміж міліцыянтамі падчас акцыі, якая адбылася 14 лютага і традыцыйна была прысьвечаная каханьню.

Першы голас: Трэці, трэці, я першы. Як чуеце? Праверка сувязі. Прыём!

Трэці: Першы, першы, я трэці. Дакладаю з плошчы Якуба Коласа. Пакуль усё спакойна. Адмарозкі патроху зьбіраюцца. Мне толькі што ўпіхнулі бел-чырвона-белую валянцінку. Што рабіць з гэтай фігнёй?

Другі *(бадзёра)*: Першы, першы, я другі. Мы занялі выходныя пазыцыі ў падваротнях. У хлопцаў проста чэшуцца рукі адпомсьціць гэтым апазыцыянэрам за 17 кастрычніка! Чакаем Вашага загаду.

Першы: Трэці, працягвайце дакладваць абстаноўку. Прыём.

Каханьне не адносіцца да іх, аднак каханкі атрацяць уяму бабла. Замест таго, каб выкідаць шалёныя грошы на кветкі і падарункі, давайце лепш аддамо іх у фонд Арміі выратаваньня, каб нейкі галодны хлопчык ў далёкай Батсване атрымаў падарунак на дзень арміі Сьвята-Марыскага Збаўцы. Што ж тады рабіць у дзень сьвятога Валянціна? Вось што раіць адзін з аўтараў старонкі: «Прыйдзіце на працу ў чорным, абламайце настрой усіх калегаў, тых, хто спрабуе падкаціцца з «валянцінкамі» – пасылайце падалей, увечары проста нажрыцеся як той докер і ідзіце на марш Маладога Фронту, там дакалябіцеся да нейкай закаханай парачкі, або амапаўца».

Трэці: Дакладаю, таварыш палкоўнік. На плошчы зьявіўся лідэр Маладога Фронту аб'ект С. Нясе нейкую лажу пра каханьне і... пра Бога. Ён што, чокнуты, таварыш палкоўнік?

Другі *(з камком у горле)*: Таварыш палкоўнік, колькі можна мёрзнуць! Дубар у гэтых аўтобусах. Давайце загад мачыць адмарозкаў!!!

Трэці: Спакойна, сокалы, пачакайце. Хутка адарвецеся як мае быць. Трэці, паспрабуйце пранікнуць у натоўп бліжэй да аб'екта С. і працягвайце апэратыўна дакладаць сытуацыю.

Трэці: Слухаюся, таварыш палкоўнік. Я ў самым эпіцэнтры калёны экстрэмістаў. Разам з натоўпам рушу ў бок тэатра опэры і балету. Каб не раскусілі таксама расьпяваю апазыцыйную ахінею. Любоў, Ай лав' ю!!!

Другі *(прыкашліваючыся)*: За...ло!!! Колькі можна тут стаяць у падваротні. Дайце нарэшце загад! Хочам мачыць адмарозкаў!!!

Першы: Рана. Няхай галубчыкі бліжэй да цэнтру падыйдуць. Тут мы ім і пакажам, як прэзыдэнта трэба любіць. Трэці, што ў Вас?

Трэці: Я на плошчы Парыскай Камуны. Тут нейкая сапраўдная рэлігійная оргія. Аб'ект С. кажа пра тое, што Хрыстос праліваў за нас кроў і мы павінны яго кахаць. Цікава гаворыць. Пайду паслухаю бліжэй. Прыём.

Першы: Не зьвяртай увагу на дробязі, трэці. Менш слухай, больш глядзі.

Другі *(хрыпла)*: Давайце загад, таварыш палкоўнік, косьці разьмяць.

Першы: Добра, трэці, вазьміце на заметку аб'ект С. і вядзіце яго да бліжэйшай падваротні. Будзем вінціць апостала нашага.

Трэці: Я не магу, таварыш палкоўнік.

Першы: Не зразумеў. Трэці, што ў вас? Прыём... Чаму маўчыце, трэці? Прыём!

Другі: Таварыш палкоўнік, даю зуб, яго вылічылі. Гэта ў стылі Скочкі – заманіць словамі пра каханьне, а потым «трах!» арматурай па купалу. Я ж казаў – давайце мачыць адмарозкаў!

Трэці: Я празрэў! Я ўсё бачу!!! Я адчыніў для сябе Бога!!! Ідзіце вы ў дупу з вашым рэжымам. Асабіста я зараз іду за Севярынцам да касьцёлу сьвятога Роха на набажэнства. I love you!!! Першы і другі пакайцеся! Кахайце адзін аднога ўсім сэрцам сваім і ўсёй існасьцю сваёй!..●

«Hate is...» гэта калі...

«Усё, што нам патрэбна, гэта любоў!» – менавіта гэтак сьпявалі некалі папулярныя бітлы. «Згвалці мяне, карыфан!..» – гарланіла на пачатку 90-х Nirvana. Людзі з кветкамі ў валасах, вольнае каханьне, – гэтыя часы даўно і беспаваротна абрынуліся ў мінулае. Літаратура, кінематограф, шоў-бізнэс – уся поп-культура ісьпісала на сьмерць пазытыўнага героя. На зьмену закаханаму хлопіку прыходзіць культ Нянавісьці, гэткага Мэнсана, які з усьмешкай на твары, флегматычна чаўкаючы жуйку, вырывае гланды праз анал без наркозу. Штодзённа на тэлеэкранах гвалт, кроў і нянавісьць. Нават у рэклямных паўзах замест жацьцярадасных шакаладак мы аглядаем культ канібалізму ад M&M's. Так, не абышла бокам плынь імпэрыі зла і вытворцаў ласункаў.

На пачатку 70-х на хвале агульнай любові, была створаная фірма па вытворчасьці жуек «Love is...». Фанцікі ў гэтых жуек павінны былі вучыць дзетак звычайных бюргераў, што такое сапраўднае каханьне. «Каханьне – гэта калі ты прыносіш сваёй каханай каву ў ложак», ці «...Калі ты цыруеш ягоныя парваныя шкарпэткі.» Усе былі рады і ўсім было добра.

Зь цягам часу ў кіраўніцтва фірмы пачало прыходзіць маладое пакаленьне і згодна са зьменамі культуры і патрэбаў рынку пачалі зьмяняцца слоганы на фанціках. Ужо на пачатку 90-х бацькі, купіўшы жуйку свайму чаду, маглі зьдзівіцца тэкстам тыпу: «Каханьне – гэта калі ты выразаеш імя каханай на ўсіх дрэвах у нацыянальным парку.», ці «...Калі ты атручваеш суседзкага сабаку, які не дае каханаму спаць.»

Але зараз перамены ў фірме можна съмела называць рэвалюцыйнымі. Пасьля апошніх пэртубацыяў у фірме (звальненьні, перастаноўкі там рознымі) рада дырэктараў, вырашыла поўнасьцю зьмяніць імідж фірмы. Першая грунтоўная – зьмена гэта назва. Малады імідж-мэйкер давёў дырэктарам, што самая ўдалая назва на дадзеным этапе фірмы будзе «Hate is...». Згодна з назвай зьмяніўся і зьмест фанцікаў. Для здымкаў рэклямнага ролiку фірма запрасіла рэжысэра О.Стоўна, які прапанаваў нарэзку псіха-садысцкіх урыўкаў, з чаўкаючымі забойцамі і слоганам, у якім з цэнзурных словаў толькі назва фірмы.●

Камасутра для аднаго

Калі вы стаміліся ад папрокаў пастаяннага партнэра

Вось такія непамысныя позы для заняцьця тантрычным ананізмам набываюць папулярнасьць

На днях у рэдакцыі газэты *Навінкі* адбылася прэзэнтацыя скандальнай у элітарных колах кнігі «Камасутра для аднаго». Адначасова з прэзэнтацыяй адбываўся аўтарскі паказ магчымасьцяў чалавечага цела і самых добрых пазыцыяў дзеля дасягненьня аргазму.

«Спачатку я ўспрымала гэта як нешта пастыдовае. Ведаеш, у грамадзтве пераважае такая думка, што калі ты займаесься сэксам сам з сабою – гэта анармальна. Да таго ж народны гумар тыпу «Сэкс безь дзяўчыны – прызнак дурачыны» адкладае свой уплыў у разуменьні мастурбацыі як нечага памылковага і тымчасовага», – гаворыць Ганна Выгібалава, аўтар кнігі «Камасутра для аднаго». – «Але чалавечы арганізм гэтак пабудаваны, што хочаш ці не, ён імкнецца задаволіць свае патрэбы самастойна. Першы раз я адчула аргазм сама з сабой, калі мне было адзінаццаць гадоў. У піянэрскім лягеры я сьніла нейкі эратычны сон пра мяне і генэральнага сакратара. Ну і ў самы адказны момант, калі я амаль што прачнулася, я аўтаматычна, памагла сабе рукою. Зараз мне сьмешна, калі я ўспамінаю тыя часы, бо гэтая дапамога была такая няўмелая. Але самае галоўнае, што я перажыла апасьля аргазму. Сорам мой ня меў граніц, толькі па праходу двух дзён я вырашыла падзяліцца гэтым са сваёй каляжанкай. Але тая замест таго, каб падтрымаць мяне і супакоіць распаявяла ўсё маяму важатаму. Так мяне выключылі зь піянэрaў.

Потым была перабудова, чэрці ў крамах. Я амаль што запамятала пра тое, што гэта можна рабіць сама з сабой. І вось аднойчы ,стаючы ў чарзе, я адчула аргазм, за кошт таго што людзі што стаялі побач штурхалі мяне на вугал стала. І вось мінавіта тады мяне асяніла думка што я магу рабіць сабе прыемна без дапамогі каго бы та нібыла. Некаторы час я займалася ёгай і гімнастыкай, потым ужо калі я праштудзіравала камасутру, я зразумела што ў гэтай вялікай кнізе ёсьць шмат недахопаў па тэме самаздавальненьня. Так што маё вучэньне трэба ўспрымаць як мікс язды ў грамадзкім транспарце, ёгі, акрабатыкі і камасутры. Мэта маёй кнігі, гэта папулярызацыя ідэі , што кожная хатняя работніца можа зрабіць сваё сэксуальнае жыцьцё яскравым, каляровым і багатым на аргазмы, не залежна ад штодзённа занятага супруга. Кахайце сябе самастойна, не саромейцеся свайго цела – і вас чакае шчасьце і даўталецьце.»

На гэтым размова з Ганнай скончылася. На заканчэньне я б хацеў сказаць, што гэта звычайная беларуская кабета, алеж апасьля таго, як я пабачыў паказ яе магчымасьцяў, нават як карэспандэнт самай жоўтай газэты, я не магу сабе гэтага дазволіць ●

З Г.Выгібалавай размаўляў
Р.З.Глухі

Бэстсэлер

Славянскія каханкі

Дыскутуючы мноства фактараў, якія здольныя рэанімаваць адзіную палітычную прастору, чырвона-карычневыя інтэлектуалы не пакідаюць за дужкамі патэнцыял простага чалавечага каханьня. Гэтак маскоўскі літаратар Чулакі прапанаваў публіцы свой новы раман «Московский амур», у якім геена пяра малюе свой варыянт адраджэньня вялікага саюзу. Сюжэт кнігі наступны.

Прэзыдэнтам Расеі абіраюць мужыка, а Украіны – цёлку. На нейкім палітычным раўндзе памiж імі пачынаецца бурны раман, што выходзіць за межы бытавога перапіхону. Родзічы закаханых і алігархі мэдыя-холдынгаў супраць таго каб каханкі зьвязвалі свае лёсы, аднак апошнім да фені грамадзтва абодвух славянскіх народаў. Пачынаецца скандал. Які скандал! У выніку каханкі разрываюць з сваімі сем'ямі, здымаюць двухпакаёўку на Баршчыгоўцы і пачынаюць жыць разам. Фактычна гэта азначае адраджэньне СССР. Хэпі энд. Адно «але»: беларусам у сваёй Санта-Барбары Чулакі адводзіць вельмі сьціплую другасную ролю. Шкада. Славянская сям'я атрымалася б.

Дзедава парнуХа

Мой дзед пакінуў мне самае дарагое – вугорскі порна-часопіс

Першае мае сутыкненьне з эротыкай атрымалася праз майго дзеда. Калі я быў маленькі, я заўсёды не разумеў, чаму стары пачынаў так хвалявацца, калі у «Міжнародны панараме» паказвалі, як паліцыя імпэрыялістычных дзяржаваў разганяе студэнцкія маніфэстацыі. Мае бацькі заўсёды выводзілі мяне з пакою, маўляў, «хай дзядуля крыху пацешыцца». І толькі пазьней, калі я дасягнуў пэрыяду полавага сасьпяванньня, выпадкова я дазнаўся пра тайну дзядулі.

Аднойчы стары зачыніўся ў туалеце і доўга не выходзіў адтуль. Хвалюючыся, каб зь ім ня здарылася сардэчнага прыступу ад перанапружаньня я адчыніў дзьверы і зазірнуў унутар. Дзед крэпка спаў на стульчыку, а ў яго на каленях...

Я ніколі раней ня бачыў такіх часопісаў. Ня гледзячы на тое, што гэта было старое выданьне, усё запэцканае і ў брудных плямах, яно мяне патрэсла да глыбіні душы. Я чуў ад бацькоў, што дзед яшчэ маладым салдатам удзельнічаў у падаўленьні Будапэшцкага паўстаньня 1956 году. Пэўна тады, у Вугоршчыне, ён і набыў гэты часопіс.

На чароўных старонках я ўбачыў фотакомікс пра сэксуальнае жыцьцё вугорскай моладзі пачатку 50-х. Я не разумеў вугорскай мовы, але гэта і не было патрэбна. Сюжэт быў даволі простым: хлопец знаёміцца зь дзяўчынай і запрашае яе да сябе ў госьці. Там яны займаюцца любоўю. Потым хлопец тэлефануе свайму сябру, той прыходзіць разам з сяброўкай і яны ўсе разам займаюцца любоўю. Потым сябры тэлефануюць на сьвінафэрму, ім прывозяць парсючка і яны ўсе разам займаюцца любоўю. Потым гаспадар кватэры пачынае раўнаваць сваю дзяўчыну да парсючка. Успыхвае сварка, потым бойка, але ўсё скончваецца добра: парсючок гіне ад нажа раўніўца, каханыя міраццa і ўсе зноў займаюцца любоўю.

Фатаграфіі былі выкананыя на даволі добрым прафэсійным узроўні: усе анатамічныя падрабязнасьці ўдзельнікаў здымак былі добра бачны. Пэўна таму гэты часопіс аказаў такое ўзьдзеяньне на майго дзеда, што ён ніколі не ажаніўся і не завёў сям'і. Галоўнай падзеяй яго сэксуальнага жыцьця стала набыцьцё порначасопісу. Таму дзядуля, калі бачыў бойкі студэнтаў з паліцыяй, успамінаў сваю маладосьць і найбольш яркае сэксуальнае перажываньне. Мой дзядуля ўжо даўно памёр. Але ягоны часопіс я захоўваю ў верхняй шуфлядзе свайго стала і заўсёды праглядаю перад тым, як пайсьці на апазыцыйны мітынг ●

Алесь Брудзіла-сярэдні

Калі ты не падпішысься на газэту **НАВІНКІ**



Мы заб'ем гэтага сабачку!

Умовы падпіскі:

на 1 месяц (2 нумары) – 80 руб.
на 3 месяцы (6 нумароў) – 240 руб.
на 6 месяцаў (12 нумароў) – 480 руб.

Падпіску можна афармiць у любым аддзяленьні сувязі да 10 числа кожнага месяца.

Наш падпісны індэкс

63439

Народны аблём лорда Ўэбэра

Несьвяты вечар зь Лявонам Вольскім



Зараз, напярэдадні імпрэзы «Народны альбом», самы час высьветліць, якія настроі пануюць у стваральнікаў гэтага ўнікальнага праэкту. Не сакрэт, што адным з патрыярхаў беларускамоўнага рок-лягеру зьяўляецца Лявон Артуравіч Вольскі. Хто ён, прадстаўнікам старэйшага пакаленьня, думаецца, тлумачыць ня трэба, бо тыя ўсё роўна нічога не зразумеюць, у адрозьненьне ад па-вар'яцку кемлівых дзяўчынак-тынэйджэраў, гатовых на ўсё дзеля свайго ідала.

Я, зялёны юнкар, шчыра кажучы, нават трохі зьбянтэжыўся, калі нечакана напаткаў зорку такой велічыні на месцы тусоўкі менскіх хіч-хайкераў, хакераў ды й іншых мазафакераў, у бары «Янкі Гоў Хоўм». Непрыступны чалавек-легенда, якім ён уяўляецца, калі паглядае на нас з глянцавых вокладак дарагіх часопісаў, у жыцьці аказаўся простым, сьціплым чалавекам і адразу згадзіўся адказаць на колькі пытаньняў. Размова адбылася ў цёплай утульнай атмасфэры за куфлікам піва...

К.К.: Па-першае, Лявон Артуравіч, хацелася б павіншаваць Вас з тым, што Вашыя сваякі па лініі Пітта Паўлава, так бы мовіць, браты ды сёстры па крыві, гурт КРЫВІ, атрымалі-такі ўсе належныя рэгаліі і больш, напэўна, не адчуваюць сябе дыскрымінаванымі ў каралеўскай сям'і N.R.M.&Co. Дарэчы, менавіта ў рэчышчы вашай супольнай працы й хацелася б павесьці гутарку. Я маю на ўвазе найбольш яскравы, на мой погляд, і беспрэцэдэнтны па сваім посьпеху праэкт «Народны альбом», праслухоўваючы які, ужо былы заканадаўца мюзіклавай моды Эндру Ллойд Уэбэр – нават не адпачывае, а, напэўна, нэрвова адбівае чачэтку на фано, калі ў парыве гістэрыі не зьнішчае партытуры сваіх некалі бесьсьмяротных твораў. Нават самая знакамітая опэра Ўэбэра «Ісус Хрыстос Супэрзорка», зь яе неардынарным сюжэтам і ўдала знойдзенымі пэрсанажамі, ні па якіх крытэрах не вытрымлівае параўнаньня з працай беларускіх музыкаў. Увогуле, пераацаніць яе каштоўнасьць немагчыма, але ж няхай права на яе ўсхваленьне застанецца за крытыкамі... І ўсё ж такі, Лявон Артуравіч, нашых чытачоў, усіх фанаў хвалюе пытаньне, ці стане апошні праэкт беларускіх рок-музыкаў «Сьвяты вечар 2000» канцэптуальным працягам першай беларускай рок-опэры, г.зн. «Народнага альбому», дый ці пабачыць сьвет уласна «Народны альбом-2».

Лявон Вольскі ў побыце аказаўся сьціплым маладым юнаком

Л.В.: Давай яшчэ па піву! А?

К.К.: Лявон Артуравіч, нягледзячы на тое, што Вы ўвесь час пытаецеся адасобіцца ад якіх бы там ні было палітычных плыняў, кожны раз падкрэсьліваючы сваю апалітычнасьць, Вашая асабістая неабыякавая грамадзкая пазыцыя відавочная. Дык усё ж, у парадку выключэньня, эксклюзіўна для адэптаў *Навінак*, разблытайце, калі ласка, павуцінне дасужых домыслаў адносна Вашай арыентацыі. Каму Вы больш сымпатызуеце: Торы ці Віг?

Л.В.: Выключна рэспубліканцам.

К.К.: Дзякую за насычаную гутарку. І апошняе пытаньне. Вашая Мроя?

Л.В.: Незалежная Рэспубліка ●

Размаўляў **Кастусь Камочак**

Чаму забілі нэгра

Па старонках патрыятычнай прэсы газэта *Я–русский* заканамерна карыстаецца калясальным попытам з боку амаатараў жыда-масонскай змовы. Толькі тут друкуецца даставерная і праўдзівая белібэрда наконт проіскаў сіянісцкіх цэнтраў і крызыснага стану, у якім апынуўся славянскі падвід дзякуючы заходнім крэдытам. Прапануем вашай увазе перадрукаваны з *Я-Р* супэрэксклюзіў: Адкуль нарадзіўся музыкальны блокбастэр 1999-га «Ай-яй- яй, убили негра».

Адным з папулярнейшых хітоў мінулага летняга музычнага сэзону была рытмічная і непрыкметная песьня «Ай-яй- яй, убили негра» гурта ЗАПРЕЩЕННЫЕ БАРАБАНЩИКИ. Гісторыя, што паслужыла падставай для напісаньня песьні, аказваецца, мела месца быць на самой справе.

Малады чысталюбівы студэнт Універсытэту Дружбы Народаў прыбыў з далёкай краіны з мэтай дастаткова дастойнай – вывучыць расейскую мову, пазнаёміцца з гісторыяй белага казацтва і напісаць гісторыю пра побыт і норавы казакаў сучаснай РФ. Усе звалі гэтага парня імем На-на, або нанаец і да сёньняшняга дня памятаюць у шматлікіх казачых курэнях.

Нанаец шукаў матэрыялы аб казаках і запісваўся ў шматлікія казацкія арганізацыі. Казакі нават падаравалі нанайцу бутафорскую драўляную шашку з надпісам «За Русь святую!» і шаравары з лампасамі, пасьля чаго пасадзілі на кабылу. Але той зваліўся са страпцівай, ды гэтак няўдала, што ўшыб сабе сьпіну. Пасьля гэтага выпадку На-на ахладзеў да казакоў і, як пяецца ў песьні, да баскетболу таксама.

Пакуль нанаец лячыў сабе сьпіну, ён упарта вывучаў вялікую расейскую мову. Пытлівы розум нігерыйца ўвесь час натыкаўся на словы, якіх чамусьці не было ў слоўніках. Прыйшлося вывучаць блатную феню па літаратуры ў натуры. Гэта яго так захапіла, што ён нават зрабіў наколку «Не забуду мать родную!», амаль нечытэльную на чорным фоне, стаў прытаргоўваць гераінам, а знаёмым пры сустрэчы казаў: «Я блакнот, я блакнот» і абавязкова дэманстраваў любімую наколку.

Ад думкі напісаць кнігу На-на не адмовіўся, толькі цяпер ён пачаў зьбіраць матэрыялы аб бамжах. Зьявіліся знаёмыя наркаманкі і бамжыхі. У адным з бамжовых падвалаў нашаму герою праламілі чэрап кірпідонам і, як пяецца ў песьні, «замачылі насовсем». Гісторыя на гэтым зусім не сканчаецца. Каб схаваць труп, бамжары дадумаліся засунуць яго ў... бочку з квасам, якім цунарэфы штодня травілі народ недалёка ад станцыі «Семеновская» ў Маскве. Квас прыгатаўляўся гэтак: у апусьцелую іржавую бочку ўначы заліваліся чырвонае сусло, а потым напаўнялі аб'ём да краёў вадой з сыстэмы ацяпленьня, прама з крану на батарэі суседняга падвалу. Бамжы цудоўна ведалі аб гэтым і, улучыўшы момант, запіхнулі труп небаракі ў гарлавіну квасной бочкі...

Мясцовыя жыхары сьцьвярджаюць, што праз тыдзень, калі раздуты трупак быў усё ж знойдзены, СЭС вывесіла прама на гэтай сама бочцы аб'яву наступнага зьместу: «Увага! Грамадзянам, спажыўшым квас з гэтай ёмкасьці, на працягу наступнага тыдня неабходна абавязкова здаць аналіз на рэакцыю Васэрмана».

Вось гэтак і нарадзілася заключная частка песьні аб ажыўленым нэгры-зомбі. Гэтую павучальную і разам з тым жудасную гісторыю мне распавялі нядаўна сябры адной маскоўскай групы скіноў ●

М. Масквічоў

КлЮбнае рэвЮ

Мачы папсу!

Ні для каго не сакрэт, што сярод пэўнай часткі сталічнага андэграўнду клюб «Альтэрнатыва» карыстаецца дурной славай камэрцыйнай установы, дзе быццам правяць баль грошы і прымітыўны спажывецкі густ. Некаторыя нават байкатуюць будынак на Бяды, 4.

Яшчэ далей пайшоў адзін зь дзеячоў сталічнай хард-коравай сцэны Юрась К. з гурта СОНЦА МАО. На канцэрце памяці Боба Марлі п'яны ў сіскю панк-фундамэнталіст вываліў сваю піпетку і пачаў флегматычна адліваць на стойку бара. Купка прысутнай публікі сустрэла канцэптуальную выхадку жыдкімі, але гучнымі аплядысмэнтамі. У наступную сэкунду змагар за ідэалы рок-індэпэндэнта быў скручаны вышыбаламі, выкінуты з залі і добра праваны на фанеру.

Пасьля гэтага інцыдэнту Юра не здаецца, і цяпер у знак пратэсту супраць шоў-бізнэсу плянуе накласьці на Трубе кучку экскрэмэнтаў.

Правал дэкадэнтаў

У пераабарудаваны пад тэхна-клюб «Орландо» бібліятэцы імя Я.Коласа днямі адбылася прэзэнтацыя латыскага праекту «Е-лаб». Спонсарам вечарыны быў нехта Міка Хакінен, аўтасьлесар з Хельсінкі, які ахваляе ўсё зароблене бабло на разьвіцьцё rave-руху ў краінах СНД. Зразумела, што на скандынаўскую халяву зьбеглася кодла тусоўшчыкаў: у залі нават не хапала столікаў – шмат хто сядзеў на падушках, якія прывез з дому сам Конь. Госьці з Латвіі пазьбягалі кантактаў са славянскімі недачалавекамі, спасылаючыся на тое, што можна нефіг пэдхапіць грып.

Раптам зьявіліся прадстаўнікі г.зв. «творчай эліты» – Вішнеў, Сін і Мінскевіч. Адразу па руках пайшоў гуляць фірмовы арыстакратычны кактэйль беларускіх літаратараў: піва «Казіно» + мазырская вадзяра. Вішнеў з шалёным асьцервяненьнем чытаў свае віршы, ды гэтак, што ў прысутных тынэйджэраў выліваўся з роту непраглынуты «спрайт». Рэакцыя на літаратурныя пасажы не прымусіла сябе чакаць: «Музон давай! На хер гэтых паэтаў! Танцы дзе? Заепала!»

Так рэагавала маладзёвая аўдыторыя на зрыў вечарыны. «Прыйшлі, дя, баб зьняць – а тут як у бібліятэцы!» – кіпяціліся разагрэтыя «Чарадзеем» і «Балтыкай» пацаны. Усе разышліся па хатах сумныя і цьвярозыя.

Казанціп сасе

Што рабіць з Грозным, які расейская армія раскурочыла на дробныя кавалкі – гэтае оргпраблемнае пытаньне актыўна дыскутуецца на старонках расейскай прэсы. Думкі экспэртаў самыя антыпалюсныя: адны за тое, каб адбудаваць чачэнскую мэтраполію як было, другія за тое, каб перанесьці сталіцу Чачэніі ў напалову ацалелы Гудэрмес. Фігня ўсё гэта! Грозны трэба перадаць на парукі тэхна-тусоўшчыкам, якія проста прыцца арганізоўваць сэйшны на фоне індастырыэлу. Хто на тусоўках не ведае 4 блёку недабудаванай АЭС у Казанціпе, дзе кіслотныя хмыры кожнае лета круцяць свае вінілы. Грозны куды круцей. Прыкіньце, вакол – адны руіны. Ніводнага гопніка. Крок у бок – і натыкаесься на міну-расьцяжку, на фугас з амякам, або проста на трупак. Экстрэмум поўны! Гэта толькі шчыкочыць нэрвы комплексным тынэйджэрам. Другі аргумэнт. Хто ў нас фанат на рэйв'. Зразумела, залатая моладзь абодвух сталіцаў. Уявіце, якія фінансавыя ін'екцыі будуць ісьці ў бюджэт адноўленай чачэнскай аўтаномнай рэспублікі, калі сьвінёнышы Беразоўскага рвануць на пл.Мінутку, каб адарвацца на чарговай рэйв'-опэн-эйр-паці. Гантэміраў проста азалаціцца ●

ПОты

Ці будзе карнавал?

Вы не паверыце, але нарэшце пабачыў сьвет новы альбом інфантыльных маньякаў і пэдафілаў з загадкавай назвай МУМИЙТРОЛЛЬ. Ізноў краіна дзеліцца на прыхільнікаў і праціўнікаў підаватага хлопчыка Ільлі Лагуценкі. Зноўку гомафобы ванітуюць перад блакітнымі экранамі, а маладыя школьніцы мастурбуюць, зачыніўшыся з фоткай Ільлюшы ў прыбіральні. Усё было б банальна й звыкла. Аднак ужо па кліпу было відаць, што нешта ў творчасьці Лагуценкі беззваротна зьмянілася. Кліп мае назву «Карнавала не будет» на аднайменную песьню і ўжо актыўна круціцца па расейскім тэлебачаньні.

Дарэнка выступае ў гальштуку колеру хакі, Пуцін у вайсковай касцы, і гурт мумітроляў у шынэлях. Тэма вайны, як у клясыкаў, кшталту «Вьется в тесной печурке огонь...». «Карнавалу на будзе!» – сьпявае Лагуценка, і звычайны расеец разумее: трэба мачыцца, а не карнаваліць. Музыка, праўда, усё тая ж, але імідж усяго гурта радыкальна зьмяніўся ў бок маркітанак, такіх прыгожых і сэксуальна разбэшчаных, якія зарабляюць на вайне. Пра што кажуць і астатнія хіты з альбому: «Не очень» (трэба мацней мачыць), «Скорее быстро» (возьмем Грозны ў тры дні), «Жабры» (возьмем за жабры вахабіта), «Ему не взять тебя» (як ня стацца закладнікам), «Тише», «Случайности» і г.д.

Сапраўды ўражвае. Які напор, які патрыятызм!

Слухаючы гэтыя лагуценкавы тварэньні, рука сама паняволі цягнецца да аўтамату.

Бяжы, Лола, бяжы!

Гэты фільм-кліп сабраў шалёную касу ў Эўропе і Амэрыцы. Але гаворка пойдзе зусім пра іншае...

Стыгматы/Stigmata
Рупэрт Уэйнрайт, ЗША, 1999
У ролях Патрыцыя Аркэт, Гэбрыэл Бірн, Джонатан Прайс

Жанчыны-цырульнікі – самыя модныя гераіні апошняга сэзону. Не пасьпела далёка зьбегчы нявеста (Джулія Робэртс), як на экране зьявілася яе калега Фрэнкі (Патрыцыя Аркэт). Але ж на гэты раз мы бачым не любоўную драму, а сапраўдны трылер: на руках і нагах дзяўчынкі праступаюць язвы – адзін у адзін як у Хрыста (ну, на худы канец, як у хворага бытавым сыфілісам трэцяй ступені). На гэтым і завёрнутая фабула фільму, бо як ведае кожны атэіст, стыгматы зьяўляюцца толькі ў двух выпадках: калі чалавек моцна і аддана верыць, і калі ня мые рукі. А Фрэнкі – звычайная маладая дзяўчынка, якая кожны ранак чысьціць зубы і вядзе цалкам нармальны лад жыцьця: хлопцы, здаровы й бясьпечны сэкс, nightclubbing і Smashing Pumpkins, ніякай рэлігіі і эзатэрыкі. У тут на табе – язвы на руках.

Гэтую тайну вырашыў разгадаць бабілёнскі Фокс Малдэр, айцец Эндру. Можна не сумнявацца што на працягу адной гадзіны ён дакапаецца да ісьціны. Аднак пасьля мітычных літар «the end» у гледача зьяўляецца шмат пытаньняў. Напрыклад, ці сапраўды стыгматы – гэта новая форма скуранога захворваньня, якая перадаецца кантактным шляхамі і чаму галоўная гераіня, напоўненая «сьвятым духам», гэтак жудасна нагадвае гераіню з «Экзарцыста», апантаная кімсьці зусім іншым, і самае галоўнае: чаму айцец Эндру гэтак падобны да Сатаны з «Канца сьвету». Ня верыцца, што толькі з-за таго, што абодвух грае геваты Гэбрыэл Бірн. Само сабой напрошваецца ў галаву думка, што калі Сатану выганяе слуга Божы, то можа, Госпада Бога павінен выганяць слуга зь іншай фірмы. Адна мая знаёмая сказала што ўсё, што я думаю наконт гэтага фільма –гэта лухта, а «Стыгматы» – гэта проста доўгі кліп.

Хто ж вылекуе бедную ахвяру ад няведамай напасьці? Паглядзіце гэты трылер.

Для пацьверджаньня гэтай вэрсіі ёсьць усё: музыка модных (некалькі гадоў таму) гуртоў, знаёмыя твары (Бірн&Аркэт плюс Джонатан Прайс), падаючыя ў ваду кроплі крыві, пісьмёны, што ўзьнікаюць зпад рукі дзяўчынкі, біцьцё шкла, парывы ветру, дождж над горадам, чорныя птушкі, натоўп верующых, бразыльская экзотыка, пітсбурская штодзённасьць і рэлігійная сымболіка.

Усё можна патлумачыць тым, што рэжысэр Рупэрт Уэйнрайт шмат гадоў здымаў відэакліпы. А што сцэнар дураваты, дык што вы хацелі, які яшчэ сцэнар можа быць у кліпа? Ня кожнаму ж здымаць «Бяжы Лола, бяжы!» ці, на худы канец, «Прыроджаных забойцаў». Лепш за ўсё гэты фільм паказваць на танц-поле пад час угару, там ён будзе глядзецца лепш, чым у кінатэатры «Кастрычнік» ●

Р.З.Глухі

На сустрач Юбілею

Шаноўны чытач!

Адказы правільна на пару кантрольных пытаньняў і, о цуд! ты атрымаеш запрашальны білет на ўрачыстыя сьвяткаваньні, прысьвечаныя юбілею газэты *Навінкі*, якія адбудуцца 24 лютага ў клюбе «4 апельсіна».

Адказы перапраў у рэдакцыю газэты як мага хутчэй.

Абавязкова пакінь свой кантакт!

1. Якім тыражом выйшаў першы нумар газэты «Навінкі»?
А) 5200 экз. Б) 1000 экз. В) 299 экз.

2. Колькі гадоў спаўняецца газэце «Навінкі»?
А) 1 год; Б) 2 гады; В) 4 гады

3. Зь якога разу была зарэгістраваная наша газэта?
А) з 1; Б) з 2; В) з 3.

4. Які налітычны дзеяч быў праваны ў №1 газэты «неўтаймавальным бусьлікам»?
А) Міхаіл Аркадзевіч Чыфір;
Б) Аляксандар Рыгоравіч Лукашэнка;
В) Зураб Станіслававіч Хмызьняк.

5. Колькі судовых справаў выйграла рэдакцыя газэты?
А) адну Б) усе В) ніводнай

6. Якая пэрыядычнасьць нашай газэты?
А) раз на месяц
Б) два разы на месяц
В) як атрымаецца, так і выходзіць

Верны сын Чыяпасу

«Гэты посьпех – мой пасільны ўнёсак у непераможную справу Эмільяна Сапаты» Карлас Сантана

«Хопіць ужо гэтаму дацінасу панаваць у Білбордзе і грэсьці бабло рыдлёўкай», – вырашылі пэнтагонаўскія ястрабы. Хто-хто, а яны добра ведаюць, куды пайшлі тыя грошы.

І сапраўды, за дзесяць тыдняў панаваньня новага альбому Карласа Сантаны «Supernatural» («Супэрнапаратрупер») ва ўсіх сусьветных чартах ён нарубіў столькі капусты, што яму хапіла б на тое, каб пабудаваць цэлы квартал уласных хмарачосаў. Куды ж падзеў тыя грошы мэксыканскі дэспэрада, які працягвае жыць у сьціплым пяціпавярховым бунгала на беразе Ціхага акіяну? Адказ стане відавочным, калі мы зазірнем у недалёкае мінулае Карласа. Дзяцінства Сантаны прайшло ў найбольш бедных раёнах гарадку Сан-Крыстабаль, што на Чыяпасаўшчыне. Менавіта там ён з малаком маці ўсмактаў лад жыцьця і ідэалы мясцовых сапатыстаў, якім заставаўся верны напрацягу ўсёй сваёй творчай кар'еры. Вернасьць вернасьцю, аднак хрэн бы мясцовая сапатысцкая кодла адпусьціла таленавітага юнака на бяскрайнія прасьцягі Амэрыкі, калі б ён не падпісаўся крывёй за тое, што ільвіную частку сваіх ганарараў будзе пералічваць на алтар сапатызму-эмільянізму.

Зьлева направа: Панча Вілья, Эмільяна Сарата, Сальвадор Альендэ, Джэніс Джоплін (старэйшая)

«У сваім новым альбоме я выкарыстоўваў тэхніку транс-цэдэнтных эсхаталягічных кодаў, якія застаўбілі ў свой час яшчэ мэксіканскія чараўнікі-бруха. Пасьля праслухоўваньня такіх закадаваных песьняў зьбянтэжаныя лахі-грынга згодныя несьці грошы мяхамі», – прызнаецца Сантана. Наколькі гэта адпавядае рэчаіснасьці – пытаньне. Але дакладна вядома, што перадавыя часткі сапатысцкіх паўстанцаў узброіліся нядаўна дзьвюма ўстаноўкамі «Град», па чутках, расейскага паходжаньня.

Занепакоеныя такім становішчам, хцівыя цэрэушнікі вырашылі сутыкнуць ілбамі дзьве патэнцыйна небясьпечныя для імпэрыялізму мафіі – лацінаамэрыканскую і нэгрыцянскую. Апошнім часам на першыя радкі хітпарадаў выходзіць блэкмэн D'angelo зь нейкай папсьнёй пад назвай «Voodoo». Вядома ж, нэграм таксама патрэбныя грошы, каб падтрымаць Black Liberation Front (Чорны Фронт Вызваленьня), які зараз знаходзіцца ў загоне з-за некаторых фінансавых праблемаў. Але Пэнтагон відавочна гуляе з вагнём. Калі гэтыя пляны спраўдзяцца, то нашчадкі «Чорных Пантэраў» нарэшце сакрушаць паганы Бабілён – Амэрыку белых, англа-саксаў і пратэстантаў. ●

Косьця Ньеда

Адказы да стар. 2

1. На правым малюнку ў кутку, калі прыглядзецца тарчаць берцы спэцназаўца, а на другім іх яшчэ няма.
2. На правым – стаіць амапавец, а на левым на яго месцы – клюмба з кветкамі.
3. На левым малюнку, балкон на пятым паверсе, а на правым ён разбураны.
4. Людзі на малюнках рухаюцца ў розныя месцы. На левым – у кіно, а на правым у бамбасховішча.
5. Хуткасьці, зь якімі яны рухаюцца, розныя.
6. На правым адно шкло цэлае, а на левым - усе.
7. Асфальт на малюнках рознага колеру: на правым с крывавымі разводамі, на левым – без крывавых разводаў.
8. На левым на заднім фоне – камэрцыйныя крама, а на правым – яе рэшткі.
9. На правым малюнку ў небе бамбардзіроўшчык, а на левым камфартабельны пасажырскі лайнэр Ан-45.
10. На левым лета, а на правым – зіма.

КОМІКС

УВАГА! Адзіным ва Ўкраіне штотыднёвым выданнем, якое друкуе рамальянцкія комікс-тэксты у арыгінальнай беларускай перакладзе!